ап҃ла павла. еже посылаеть ѡрима ті
хикомъ. а замыкае всобе главъ тры :~


8

Бл҃годарить ап҃лъ бога ѡразмножении во
вере, и волюбви, и вотерпении селунанъ
поведая ѡбидащимъ и скорое ѡмщение :~

Глава а҃ зачало сод :~

Павелъ. и силуанъ. и тимофей,
церкви селунстей. ѡбозе ѡци
нашемъ. и гд҃е ІС҃ъ Хр҃те. Бл҃го
дать вамъ и миръ, ѡбога ѡца на
шего, и гд҃а ІС҃ъ Хр҃та. дакова ти богу до
лжни есмо всегда ѡвасъ братие, ико дос
тойно е. понеже превозрастаеть вера
ваша. и множится любовь единаго каж
даго сокупе. тако иже мы сами похвал

XXXIX



ПОСЛАНИЕ :~

Строитель градскій. и кувере братъ братъ,
Бл҃годать господа нашего ІС҃а
Хр҃та совсеми вами
аминь :~ ісо. пн.

8

Доконано есть чудное кримлянамъ по
сланиé, ст҃го верховного енеже наученого
учителя, хр҃тся ап҃ла, и мученика павла
Богу вотройци единому кослаеве
людем посполитым к научению
выложено доктором фра
нцискомъ скориною
славнаго града
полоцька

~о~

т

ѿ послано вкоринфе. і послася ..... ѿ
.....

XL

КРИМЛЯНОМЪ

кз

воздаванйте, разумне чийте доброе предъ всеми человеки. и аще возможно е ѿвасъ совсеми людми миръ имейте. неѿмъщающе сами себе возлюбленїи, но дадите место гневу. Писанобо е мне ѿмьщение е зик ло
и азъ воздамъ глеть гдь. аще ли алчеть врагъ твой накорми его, аще ли жаждеть напой его. сиебо чинай оугаие огнано собїраеши нагляву ему. небывай побежен ѿзляго, но побежай добрымъ злое :~

31

Навчаеть апстлъ давы веси властелемъ послушни были, адругъ друга любили :~

Глава гі Зачало рäі :~

Всаки душа властелем обладаю щимъ да повинуетса. несть бо П рем
власти аще неѿбога. и еже суть ѿбога, повелениемъ его учинена суть. Темже противлайса власти, божию повелению противлаетса. и кто противитса

XLI

КОРИНДОМЪ

пз

твори вамъ ниединого зла. не яко да мы искушени явимса, но да вы добре творите, мы же яко неискушени будемъ. ни чтож убо неможем противу праведе, нопо праведе. Радуемсабо еда мы немощьствуемъ, вы же сильни будете. и се наиболей жадаемъ вашего совершенна. Сегоради сна пишу вамъ несый свами, да внегда прїиду квамъ неѿсечены сборю, повластии юже ми далъ гдь восозданние, а неворазрушение. Темже братиа, радуйтеса, совершайтеса, утешайтеса, тожде мудрствуйте, миръ имейте. Богъ же мира, и любве дабудеть свами. целуйте другъ друга лобзанием сетымъ. целують васъ сеетїи вси. Благодать гдя нашего Їса хрїа. и любовь божиа и общение сетго духа
совсеми вами
амин :~

XLII

РАДОСТИ

Стихъ а :~

Почитаемъ славную паметь твою богом похваленый Їоанне гдень предтече, болей всехъ пророковъ, ониже слове сы хрїа проповедаша, ты убо показавый его перстом гла, се агнецъ божий возємлай грехъ миру, того моли подати намъ велию свою милость :~

Стихъ вторы :~

Иже зачатиемъ своимъ ѿца удивилъ воутробе матерние створителя своего познавъ, и копришествию его яко вселеннаго царя радость споклонениемъ показал, темже достойнъ былъ еси, ѿсвета незаходимаго светлость принати, и воутробе посвещенъ быти, сегоради приносимъ тобе радосная чесный Їоанне предтече :~

Стихъ трети :~

XLIII

КОТИМОФЕЮ

а :~ рн

ради дающе, приобщаютса нищимъ сокриваюши собе основанние доброе вограду щее время, да приимут вечную жизнь :~ О тїмофею, преданна сохрани, уклонайса скверныхъ тщие гланей. и прелоожение лъже именитаго разума. егоже неции поживающе, ѿверы погрешиша
Блгодать стобою амин :~
конч. чсв.

7

ВТОРАГО КОТЇМОФЕЮ ПОСЛАНИА,

сетго апстла павла, сказание доктором франциском скориною сполоцка. Богу матеому кочти починаетса :~

Тое второе послание пишеть апостолъ котїмофею, будучи по имай вриме ѿнерона цара. и не можай потом прїити кнему во

XLIV

ІѠАНОВО ⁘ Дг

ратнію и черниломъ · понеже надеюса сам
пріити кваам, и ȣсты коѹстом глатн, да
радоть ваша будет и сполнена · целуют
тебе чада сесры воеа избранныа ямни ⁘ ксо па.
Конец ІѠаноеа соборнаго посланиа ⁘

32

ПОСЛАНИИ ТРЕТЕГО СКАЗА

Пишеть гаіесн, хвалечи его, иже пріе
млеть приходащую братию · Дно ре
фаже дла злоти его карает · И димитрею
доброе сведетелство и збратнею сыдае ⁘

ІѠАНОВО СОБОРНОЕ ТРЕТЕ Зачнл 01

Старець · гаіесн возлюбленному, Зл. 0
егоже азъ любаю воистинну · Во
злюбление, паче всех молюса о
тобе спеити и здраво бовати, якоже и
проспеваеть душа твоа · Радовахса бо зело
ми пришедшім братиам, и сведетелству

дпп. сырныи. старець гаіесн

10 XLV

5

ПОЧИНАЕТЬСЯ ПСАЛТЫРЬ ИЛИ ПЕСНИ СТГО ПРОРОКА БОЖИИ ДАВЫДА ЦАРЯ ЕРУСАЛИМЪСКА ⁘

ОХРИСТЕ ⁘

⁘ ⁘

11

6

33

АКАДІСТЪ ВЕЛИКОМУ ЧУДОТВОРЦУ НИКОЛЕ АРХИЕРЕЮ МИРЪЛИКИ ІСКУ НАБОЖНЕ ПОЧИНАЕМ ПЕТИ ⁘

XLVI


АКАДІСТЪ ЧЕСНОМУ НЕБЕСЕ ХВАЛНОМУ ПРОРОКУ ПРЕДТЕЧИ И КРЕСТИТЕЛЮ ГОСПОДНЮ ІѠАНУ ПОЕМ ⁘


XLVII

ЗАГАЛОЎНЫЯ ЛІТАРЫ
ЗАГЛАВНЫЕ БУКВЫ
















КАМЕНТАРЫІ
КОММЕНТАРИИ

Гравюры, якія змешчаны ў альбоме, для лепшага іх успрымання і аналізу падзяляюцца на пяць груп.

ПЕРШАЯ ГРУПА

Сюды ў асноўным адносяцца ілюстрацыі, якія змешчаны на тытульных лістах у кнігах Бібліі: «Юдзіф», «Эсфір», «Выхад», «Другі закон», «Ісус Навін», «Святога прарока божыя Данііла», «Суддзяў».

Гэтыя гравюры носяць чыста ілюстрацыйны характар. Аднак мастак, як правіла, выбірае для ілюстрацыі такі эпізод кнігі, які найбольш поўна раскрывае сутнасць твора. У гравюрах першай групы на пярэднім плане вялікімі пластычна-мадэляванымі фігурамі размяшчаюцца галоўныя дзеючыя асобы. Іх псіхалогія раскрываецца на супрацьпастаўленнях. Кампазіцыя гравюр Скарыны будуецца па прынцыпу круга альбо па прынцыпу васьмёркі. Асноўныя і другарадныя дэталі размяшчаюцца так, каб зрок пераходзіў з адной дзеючай асобы на другую і накіроўваўся на галоўнае ў кампазіцыі. Пры ўважлівым разглядзе гравюр становіцца ясна, што Скарына вельмі сур'ёзна адносіўся да выбару тэхнікі разьбы і штрыха, якія найбольш поўна раскрываюць змест гравюры.

На ўсіх гэтых гравюрах змяшчаецца манаграма — герб Скарыны.

Вось найбольш характэрная гравюра гэтай групы — «Дачка фараона і Майсей» з кнігі «Выхад». Гэта вельмі выразны, поўны глыбокага сэнсу твор. Тут усё пабудавана на проціпастаўленнях. Бясстрасная, прывыклая загадваць дачка фараона і ўсхвалявааная, поўная любві да выратаванага сына карміліца. Задаволены твар фараона, які назірае за тым, як слугі кідаюць у бурлівыя воды ракі яўрэйскіх дзяцей, і радасць

Гравюры, помещенные в альбоме, для лучшего их восприятия и анализа делятся на пять групп.

ПЕРВАЯ ГРУППА

Сюда в основном относятся иллюстрации, помещенные на титульных листах в книгах Библии: «Юдифь», «Эсфирь», «Исход», «Второй закон», «Иисус Навин», «Святого пророка божия Даниила», «Судей».

Эти гравюры носят чисто иллюстративный характер. Однако художник, как правило, выбирает для иллюстрации такой эпизод книги, который наиболее полно раскрывает сущность произведения. В гравюрах первой группы на переднем плане крупными пластично-моделированными фигурами размещаются главные действующие лица. Их психология раскрывается на противопоставлениях. Композиция гравюр Скорины строится по принципу круга или восьмерки. Основные и второстепенные детали размещаются на них таким образом, чтобы взгляд переходил от одного действующего лица к другому и направлялся затем на главное в композиции. При внимательном рассмотрении гравюр становится ясно, что Скорина очень серьезно относился к выбору техники резьбы, штриха, которые бы наиболее полно раскрывали содержание гравюры.

На всех этих гравюрах помещена монограмма — герб Скорины.

Вот наиболее характерная гравюра этой группы — «Дочь Фараона и Моисей» из книги «Исход». Это очень выразительное, полное глубокого смысла произведение. Здесь все построено на противопоставлениях. Бесстрастная, привыкшая повелевать

служанкі, якая дапамагла адвесці смерць ад аднаго з гэтых дзяцей — маленькага Майсея.

Гравюра вызначаецца эмацыянальнай насычанасцю, вобразнасцю, мастацкай завершанасцю і высокім узроўнем выканаўчага майстэрства. Праўда, падобныя малюнкі сустракаюцца і ў чэшскай Бібліі 1506 г., а таксама ў лацінскай, аднак яны выкананы значна слабей.

Кожны персанаж гравюры — жывы чалавек, кожны — індывідуальны. Прычым біблейскіх герояў аўтар паказвае ў вопратцы свайго часу. І тут, як і ў іншых гравюрах, ярка праявіліся беларускія нацыянальныя і наогул славянскія рысы. Твары карміліцы-маці і слуг, вопратка бабак-павітух — шнуроўкі, намёткі і г. д.— яўна беларускія.

У гэтай гравюры, таксама як і ў астатніх, што адносяцца да першай групы, выбар тэхнічных прыёмаў глыбока прадуманы. Штрыхі, нанесеныя на гравюру, мімаволі накіроўваюць увагу ў цэнтр кампазіцыі. Светлая фігура маці падкрэсліваецца цёмным фонам. Цікава і тое, што другі план зусім не засланяюць пярэднія вялікія фігуры. Аўтар дасягнуў гэтага тым, што змясціў цёмныя фігуркі другарадных дзеючых асоб на фоне светлага неба.

Параўноўваючы гравюры гэтай групы, можна заўважыць некаторую блізкасць у трактоўцы вобразаў. Так, напрыклад, вельмі падобныя адна на другую Юдзіф, Эсфір і дачка фараона, а прарок Данііл нагадвае селяніна-радцу з кнігі «Ісус Навін».

Ілюструючы кнігі, мастак выбірае больш блізкі яго сэрцу эпізод. Юдзіф, напрыклад, паказана ў момант помсты ворагу-захопніку. Кампазіцыя гравюры «Іудифъ Вдовица отсече главу Олферну воеводе» —трохпланавая. На заднім плане — горад.

дочь фараона и взволнованная, полная любви к спасенному сыну кормилица. Удовлетворенное лицо Фараона, наблюдающего за тем, как слуги кидают в бурные воды реки еврейских детей, и радостная улыбка служанки, которая помогла отвести смерть от одного из этих детей — маленького Моисея. Гравюра отмечена эмоциональной насыщенностью, образностью, художественной завершенностью и высоким уровнем исполнительского мастерства. Правда, похожие рисунки встречаются в чешской Библии 1506 г., а также в латинской, однако они выполнены гораздо слабее.

Каждый персонаж гравюры — живой человек, каждый — индивидуален. Причем автор показывает библейских героев в одежде своего времени. И здесь, как и в других гравюрах, ярко проявились белорусские национальные и вообще славянские черты. Лица кормилицы-матери и слуг, одежда бабок-повивалок — шнуровки, наметки и т. д.— явно белорусские.

В этой гравюре, так же как и в остальных, относящихся к первой группе, выбор технических приемов глубоко продуман. Штрихи, нанесенные на гравюру, невольно направляют внимание в центр композиции. Светлая фигура матери подчеркивается темным фоном. Интересно и то, что второй план совершенно не заслоняют передние крупные фигуры. Автор достиг этого тем, что поместил темные фигурки второстепенных действующих лиц на фоне светлого неба.

Сравнивая гравюры этой группы, можно заметить некоторую близость в трактовке образов. Так, например, очень похожи друг на друга Юдифь, Эсфирь и дочь фараона, а пророк Даниил напоминает крестьянина-советчика из книги «Иисус Навин».

Иллюстрируя книги, художник выбирает наиболее близкий его сердцу эпизод. Юдифь, например, показана в момент мщения врагу-захватчику. Композиция гравюры «Іудифъ Вдовица отсече главу Олферну воеводе» — трехплановая. На заднем плане —

Перад горадам раскінуўся вялікі шацёр, які займае большую палову поля. У шатры на высокім ложку ляжыць Алаферн з адсечанай галавой. Яго бяссільна апушчаная рука міжволі накіроўвае позірк гледача на галоўны персанаж — Юдзіф. Яна стаіць, горда абапёршыся на меч. Без ценю хвалявання кідае яна ў торбу галаву ворага. Выразны, цудоўны твар яе, якім усяго некалькі мінут назад захапляўся Алаферн, свеціцца радасцю помсты.

Тут Юдзіф перш за ўсё патрыётка. Дзеля шчасця і незалежнасці свайго народа яна гатова ахвяраваць жыццём.

На гравюры «Эсфір» адлюстраваны эпізод, дзе Эсфір вымольвае памілаванне свайму народу ў цара Асфера. Шчырае маленне кранае сэрца магутнага цара. А ў гравюры «Ісус Навин ведеть людей Ізрайлевы чере Іордан» адлюстравана адзінства і мэтанакіраванасць людзей, якія паслухмяна ідуць за сваім кіраўніком і перамагаюць. У гравюры «Данііл перамагае льва» паказана веліч і моц чалавека — гаспадара прыроды.

ДРУГАЯ ГРУПА

Да гэтай групы адносяцца гравюры, у якіх кампазіцыя будуецца таксама па прынцыпу круга. Аднак цэнтр дзеі, галоўны яе персанаж пераносіцца ў глыбіню. І калі ў папярэдніх гравюрах усе персанажы актыўна ўдзельнічаюць у падзеі і абавязкова нясуць якую-небудзь сэнсавую і псіхалагічную нагрузку, то ўжо ў гэтай групе гравюр некаторыя дзеючыя асобы толькі прысутнічаюць. Іх магло б і не быць.

Кампазіцыя гравюр другой групы больш шырокага плану, у іх свядома падкрэсліваецца лінейная перспектыва. У некаторых з іх адсутнічае аўтарская манаграма. Замест яе мастак уводзіць прадстаўнікоў свайго саслоўя — вучоных людзей.

город. Перед городом раскинулся большой шатер, занимающий большую половину поля. В шатре на высоком ложе лежит Олоферн с отсеченной головой. Его бессильно свесившаяся рука невольно направляет взгляд зрителя на главный персонаж — Юдифь. Она стоит, гордо опираясь на меч. Без тени волнения бросает она в мешок голову врага. Выразительное, прекрасное лицо ее, которым всего несколько минут назад любовался Олоферн, светится радостью мщения.

Здесь Юдифь прежде всего патриотка. Ради счастья и независимости своего народа она готова пожертвовать жизнью.

На гравюре «Эсфирь» отражен эпизод, где Эсфирь вымаливает помилование своему народу у царя Асфера. Искренняя мольба трогает сердце могущественного царя. А в гравюре «Ісус Навин ведеть людей Ізрайлевы чере Іордан» отображено единство и целенаправленность людей, которые единодушно идут за своим руководителем и побеждают. В гравюре «Даниил побеждает льва» показаны величие и сила человека — хозяина природы.

ВТОРАЯ ГРУППА

К этой группе относятся гравюры, в которых композиция строится тоже по принципу круга. Однако центр действия, главный его персонаж переносится в глубину. И если в предыдущих гравюрах все персонажи активно участвуют в происходящем и обязательно несут какую-то смысловую и психологическую нагрузку, то в этой группе гравюр некоторые действующие лица только присутствуют. Их могло бы и не быть. Композиция гравюр второй группы более широкого плана, в них сознательно подчеркивается линейная перспектива. В некоторых из них отсутствует авторская монограм-

Некаторыя гравюры гэтай групы іншы раз паўтараюцца. Так, напрыклад, гравюра «Бічаванне Іова» з «Кнігі Іова» выкары беседуеть съцарицей Саваю» з трэцяй аркушы гэтай жа кнігі. Гравюра «Саломон стоўваецца яшчэ і як застаўка на чацвёртым «Кнігі царстваў» змешчана і на тытульным лісце «Эклезіаста».

Найбольш цікавай работай гэтай групы можна лічыць «Дыспут» з кнігі «Ісус Сірахаў». У даным выпадку Скарына не ілюструе выданне, а бярэ свабодную тэму — дыспут. Вось што гаворыць сам Скарына ў прадмове да гэтай кнігі: «Найболей о мудрости..., о справедливости, о вере, о любви, о надежи, о чистоте..., о крепости, о трезвости, о мерности, о почтивости, о щедрости, о тихости, о друголюбии, о послушании родителей своих, о справовании самого себе, о товаристестве добром и злом..., и о иншых различных многих добрых обычаях и правах...». У прадмовах да асобных кніг Біблії Скарына неаднаразова падкрэслівае ролю і значэнне навукі ў практычным жыцці.

«Дыспут» — гэта быццам замалёўка з натуры, адлюстраванне таго, як яшчэ ў часы беларускага асветніка спрэчкі, абмеркаванні садзейнічалі абуджэнню розуму, нараджэнню ісціны.

У гравюры «Навходносор Царь Вавилонский Добывае Ерусалима» з чацвёртай «Кнігі царстваў» паказаны момант бітвы. Гравюры, якія адлюстроўвалі турнірныя паядынкі, бытавалі ў Еўропе, аднак такой выразнай, такой дынамічнай кампазіцыі не было ў графіцы таго часу. Кампазіцыя карысталася папулярнасцю. Яе пераймалі. Асабліва ярка праявілася перайманне ў гравюры «Грунвальдская бітва», змешчанай у «Хроніцы польскай».

Справа ў тым, што Скарына выступае тут як гарачы прыхільнік міру на зямлі, бічуе войны, якія прыносяць спусташэнне, знішчэнне людзей. Ён яўна з тымі, хто да

ма. Вместо нее художник вводит представителей своего сословия — ученых мужей. Некоторые гравюры этой группы иногда повторяются. Так, например, гравюра «Бичевание Иова» из «Книги Иова» используется еще и как заставка на четвертом листе этой же книги. Гравюра «Саломон беседуеть съцарицей Саваю» из третьей «Книги царствий» помещена и на титульном листе «Экклесиаста».

Самой интересной работой этой группы, пожалуй, можно считать «Диспут» из книги «Иисус Сирахов». В данном случае Скорина не иллюстрирует издание, а берет свободную тему — диспут. Вот что говорит сам Скорина в предисловии к этой книге: «Найболей о мудрости..., о справедливости, о вере, о любви, о надежи, о чистоте..., о крепости, о трезвости, о мерности, о почтивости, о щедрости, о тихости, о друголюбии, о послушании родителей своих, о справовании самого себе, о товаристестве добром и злом..., и о иншых различных многих добрых обычаях и правах...». В предисловиях к отдельным книгам Библии Скорина неоднократно подчеркивает роль и значение науки в практической жизни.

«Диспут» — это будто картинка с натуры, отражение того, как при жизни белорусского просветителя споры, обсуждения способствовали пробуждению разума, рождению истины.

В гравюре «Навходносор Царь Вавилонский Добывае Ерусалима» из четвертой «Книги царствий» показан момент битвы. Гравюры, отражающие турнирные поединки, бытовали в Европе. Однако такой выразительной, такой динамичной композиции не было в графике того времени. Она пользовалась популярностью. Ей подражали. Особенно ярко проявилось подражание в гравюре «Грюнвальдская битва», помещенной в «Хронике польской».

Дело в том, что Скорина выступает здесь как страстный поборник мира на земле,

апошняга дыхання абараняе родны горад (наперадзе войска абаронцаў штандар з гербам аўтара). У гравюры адлюстраваны асабістыя назіранні Скарыны, які быў сведкай бясконцых войнаў Вялікага княства Літоўскага (1492—1494 гг., 1500—1503 гг., 1507—1508 гг., 1512—1522 гг., 1534—1537 гг.). Супраць такіх войнаў і выступае беларускі асветнік. У гравюры «Людзі божыя» з чацвёртай «Кнігі Майсея» канкрэтным і ўпэўненым штрыхом намаляваны фігуры рыцараў-вандроўнікаў у зброі, што бытавала ў Беларусі XV стагоддзя. Пад спякотнымі праменнямі сонца яны вяртаюцца на родную зямлю, а над імі развяваецца сцяг з гербам Скарыны.

У тэхнічных адносінах другая і першая група гравюр вельмі блізкія. Аднак у другой групе штрых больш упэўнены, ён смялей кладзецца па форме фігур і адзення, надаючы малюнку аб'ёмнасць.

Трактоўка некаторых вобразаў часта таксама падобна. Так, напрыклад, разважлівы вучоны, змешчаны на пярэднім плане гравюры «Бічаванне Іова», паўтараецца ў «Дыспуце». Праўда, у другім выпадку ён больш дынамічны. Двух іншых вучоных з «Кнігі Іова» можна бачыць на гравюры «Першы суд Саламона», яшчэ раз аднаго з іх — у «Дыспуце» кнігі «Ісус Сірахаў». І гэта невыпадкова. Магчыма, Скарына рашыў увекавечыць сваіх сяброў-вучоных.

ТРЭЦЯЯ ГРУПА

Фактычна паміж другой і трэцяй групамі гравюр істотнай розніцы няма. Масавыя сцэны, лінейная перспектыва, глыбіня ў раскрыцці вобразаў характэрныя для абедзвюх груп. Але, падзяляючы гравюры па чыста фармальных прыкметах, да трэцяй групы можна аднесці тыя, дзе асноўная дзея перанесена з цэнтра ў левы куток. Такія,

бичует всяческие войны, несущие опустошение, уничтожающие людей. Он явно с теми, кто, погибая, защищает родной город (впереди войска защитников штандарт с гербом автора). В гравюре отражаются личные наблюдения Скорины, который был свидетелем бесчисленных войн Великого княжества Литовского (1492—1494 гг., 1500—1503 гг., 1507—1508 гг., 1512—1522 гг., 1534—1537 гг.). Против подобных войн и выступает белорусский просветитель. Так, в гравюре «Люди божие» из четвертой «Книги Моисея» конкретным и уверенным штрихом нарисованы фигуры рыцарей-странников в вооружении, что бытовало в Белоруссии XV века. Под палящими лучами солнца они возвращаются на родную землю, а над ними развевается знамя с гербом Скорины.

В техническом отношении вторая и первая группа гравюр очень близки. Однако во второй группе штрих более уверенный, он смелее располагается по форме фигур, одежды, придавая рисунку объемность.

Трактовка некоторых образов часто тоже одинакова. Так, например, рассудительный ученый, помещенный на переднем плане гравюры «Бичевание Иова», повторяется в «Диспуте». Правда, во втором случае он более динамичен. Двух других ученых из «Книги Иова» можно встретить на гравюре «Первый суд Соломона» и еще раз одного из них — в «Диспуте» книги «Иисус Сирахов». И это не случайно. Видимо, Скорина решил увековечить в этих гравюрах своих друзей-ученых.

ТРЕТЬЯ ГРУППА

Фактически между второй и третьей группами гравюр существенной разницы нет. Массовые сцены, линейная перспектива, глубина в раскрытии образов характерны для обеих групп. Однако, разделяя гравюры по чисто формальным признакам, к третьей

напрыклад, як «Царь Саломон ставит храм господу богу Въерусалиме» — трэцяя «Кніга царстваў». Усё поле кампазіцыі займае храм, які яшчэ будуецца. Ён нагадвае будынкі, што ўзводзіліся ў тыя часы на тэрыторыі Беларусі. Ужо ў гатовым выглядзе гэты храм з'яўляецца на гравюры да чацвёртай «Кнігі царстваў». Гэта сведчыць аб тым, што Скарына працаваў адначасова над некалькімі гравюрамі.

У левым кутку гравюры — цар са світай. Ён уважліва назірае за будаўніцтвам, а дойлід, відаць тлумачачы, паказвае на пад'ёмны механізм. Шмат чаго з намаляванага тут выклікае ў нас вялікую цікавасць.

На гравюры адлюстраваны каменячосы, укладчыкі каменняў і г. д. А вось вобразы цара і яго світы ўжо не новыя. Стары дарадчык, напрыклад, той жа, што і на гравюры «Святы Іова» з кнігі «Ісус Сірахаў». Падобны ён і на прарока Данііла. У цара многа агульнага з вучонымі з «Дыспуту» і «Саборніка».

Тут усё прадумана. Усё прыцягвае ўвагу гледача да галоўнага — да будаўніцтва храма. І ўзнятая рука дойліда, і скрынка з вапнавым растворам, невыпадкова пашыраная з правага боку, і гатычныя аркі — усё накіроўвае позірк да будаўніка і каменячосаў. Кампазіцыя вырашаецца проста, моцна і лагічна. Нават прысутнасць цара не зніжае ўражання ад велічнасці працы чалавека-стваральніка.

«Самуилъ Пророк Господень Помаза Давыда Нацарство» — гэта гравюра з першай «Кнігі царстваў». Яна вырашана таксама вельмі арыгінальна. На яе пярэднім плане дзве варожыя групы, якія быццам аб'ядноўваюцца фігурай воіна-ахоўніка. Галава воіна рэзка павернута — ён глядзіць у бок незадаволенага Саула. Кампазіцыя цікавая не толькі як твор мастацтва. Яна даносіць да нашых дзён рысы сярэдневяковага гарадскога пляца, перадае тыпы гараджан, своеасаблівасць адзення эпохі Скарыны.

Вялікую цікавасць мае і адзіная гравюра на сялянскую тэму — «Руфь прабаба

группе можно отнести те, где основное действие перенесено из центра в левый угол. Такие, например, как «Царь Саломон ставит храм господу богу Въерусалиме» — третья «Книга царствий». Все поле композиции занимает строящийся храм. Он напоминает здания, возводимые в те времена на территории Белоруссии. Уже в готовом виде этот храм появляется на гравюре к четвертой «Книге царствий». Это свидетельствует о том, что Скорина работал одновременно над несколькими гравюрами.

В левом углу гравюры — царь со свитой. Он внимательно наблюдает за работой, а зодчий, видимо поясняя, указывает на подъемный механизм. Многое здесь представляет для нас большой интерес. На гравюре изображены каменотесы, укладчики камней и т. д. А вот образы царя и его свиты уже не новы. Старый советник, например, тот же, что и на гравюре «Святой Иова». Похож он и на пророка Даниила. У царя много общего с учеными из «Диспута» и «Соборника».

Здесь все продумано. Все приковывает внимание зрителя к главному — к строительству храма. И поднятая рука зодчего, и коробка с известковым раствором, не случайно расширенная с правой стороны, и готические арки — направляют взгляд к строителю и каменотесам. Композиция решается просто, сильно и логично. Даже присутствие царя не снижает представления о величии труда человека-творца.

«Самуилъ Пророк Господень Помаза Давыда Нацарство» — это гравюра из первой «Книги царствий». Она решена тоже довольно оригинально. На ее переднем плане две враждующие группы, которые как бы объединяются фигурой воина-стражника. Голова воина резко повернута — он смотрит в сторону недовольного Саула. Композиция интересна не только как произведение искусства. Она доносит до наших дней облик средневековой городской площади, передает типы горожан, своеобразие одежды эпохи Скорины.

царя Давыдава пабірае класы зажнеці». Гэта ілюстрацыя да кнігі «Руф» сведчыць, што Скарына добра ведаў і любіў родную зямлю. І ўзвышаны ландшафт, і камяністая дарога, парослая хмызняком, і спелае жыта ў лагчыне вымалеваны вельмі дакладна. Відаць, што аўтар любуецца краявідам, жняцамі, іхнім адзеннем — маляўнічымі саламянымі капелюшамі, шырокімі і доўгімі кашулямі, пастоламі і нават тоўста накручанымі анучамі.

Кампазіцыя будуецца па дыяганалі — ад Ваоза, які стаіць абапёршыся на кій і глядзіць уверх,— на Руф, якая старанна падбірае каласы.

Святочнасцю і, можна сказаць, параднасцю павявае ад гравюры да другой «Кнігі царстваў» — «Царь Давыдъ играеть въгусле неся Кивот господень». Кампазіцыя яе ясная, праўдзівая. І выканана яна без лішніх штрыхоў і ценяў.

ЧАЦВЁРТАЯ ГРУПА

Гравюры гэтай групы некалькі адрозніваюцца ад іншых. Тут і стыль і тэхнічнае выкананне зусім іншыя. Штрых больш гібкі, больш жывапісны. Галоўная дзеючая асоба — бог. Воблакі, неба — усё, што акружае бога, патрабуе своеасаблівай манеры выканання, больш манументальнай, сіметрычнай кампазіцыі.

Самай характэрнай гравюрай гэтай групы можна лічыць «Стварэнне свету», ці «Шэсць дзён светабудовы», з першай кнігі Біблii — «Быцця». Гравюра складаецца з шасці асобных фрагментаў. У адпаведнасці са «Свяшчэнным пісаннем» яны паслядоўна адлюстроўваюць шэсць дзён стварэння свету. Фрагменты падзелены між сабой падоўжнымі і папярочнымі палосамі. І ў палосах, як абрамленне кожнага фрагмента, змешчаны арнамент з дубовых лісцяў замест традыцыйных назваў дзён.

Большой интерес представляет и единственная гравюра на сельскую тему — «Руфь прабаба царя Давыдава пабирае класы зажнеци». Эта иллюстрация в книге «Руфь» свидетельствует, что Скорина хорошо знал и любил родную землю. И возвышенный ландшафт, и каменистая дорога, поросшая кустарником, и спелая рожь в ложбине выписаны очень точно. Видно, что автор любуется пейзажем, жнецами, их одеждой — живописными соломенными шляпами, широкими, длинными рубахами, кожаными лаптями и даже толсто накрученными онучами.

Композиция строится по диагонали — от Вооза, стоящего опершись на посох и смотрящего вверх,— на руфь, старательно подбирающую колоски.

Праздничностью и, можно сказать, парадностью веет от гравюры ко второй «Книге царствий» — «Царь Давыдъ играеть въгусле неся Кивот господень». Композиция ее ясная, правдивая. И выполнена она без лишних штрихов и теней.

ЧЕТВЕРТАЯ ГРУППА

Гравюры этой группы несколько отличаются от остальных. У них иной стиль, иное техническое исполнение. Штрих здесь более гибкий, более живописный. Основное действующее лицо — бог. Облака, небо — вся обстановка, окружающая бога, требовала своеобразной манеры исполнения, более монументальной, симметричной композиции.

Самой характерной гравюрой этой группы является, пожалуй, «Создание мира», или «Шесть дней мироздания», из первой книги Библии — «Бытия». Она состоит из шести отдельных фрагментов. В строгом соответствии со «Священным писанием» они последовательно отражают шесть дней сотворения мира. Фрагменты разделены меж-

Гравюры на гэтую тэму стваралі і раней, у лацінскай і чэшскай Біблiях напрыклад. Аднак якасць выканання гэтых гравюр значна ніжэй скарынінскіх. Беларускі асветнік здолеў па-свойму пабудаваць кампазіцыю. Німб, які асяняе галаву бога, ён вывеў на рамку арнаменту. А ў гравюры пятага дня, дня стварэння нябесных свяцілаў, замест сонца і месяца беларускі першадрукар змясціў свой герб. Для таго часу гэта быў надзвычай смелы ўчынак. Ён яшчэ раз даказвае, што беларускі гуманіст яўна ішоў уразрэз з царкоўнымі традыцыямі, бязбоязна зрываў пакрыццё святасці і таямнічасці.

У гэтай жа манеры вырашана невялікая гравюра «Бог у раі». Скарына намаляваў тут бога простым чалавекам, звычайным пастухом, які адпачывае на ўлонні створанай ім прыроды. Прычым мастак, не лічачыся ні з якімі рэлігійнымі канонамі, зняў нават німб з галавы «творца».

У гравюрах чацвёртай групы назіраецца даволі вольнае абыходжанне з Біблiяй, што наогул характэрна для ўсёй творчасці Скарыны. І хоць большасць работ беларускага асветніка надзвычай своеасаблівыя, арыгінальныя, усё ж нельга не адзначыць, што ёсць у гэтай групе гравюр і пераймальныя. У іх яўна адчуваецца ўплыў вядомага нямецкага мастака Альбрэхта Дзюрэра. Ствараецца ўражанне, што, напрыклад, у гравюры «Тройца» Скарына свядома паўтарае распаўсюджаную, вельмі папулярную работу Дзюрэра «Бітва архангела Міхаіла з д'ябламі». Але і ў гэтую гравюру беларускі мастак здолеў унесці шмат свайго. Упершыню ён уводзіць у кампазіцыю трохлікага бога — сімвал святла. Такім чынам ён асабліва ярка падкрэслівае пафас барацьбы дабра са злом. І да таго ж работа Скарыны выканана на больш высокім мастацкім узроўні. Між іншым, херувімы, змешчаныя на гэтай гравюры, быццам перанесены сюды з «Шасцідзёна».

ду собой продольными и поперечными полосами. И в этих полосах, как обрамление каждого фрагмента, помещен орнамент из дубовых листьев вместо традиционных названий дней.

Гравюры на эту тему уже создавались и до Скорины. В латинской и чешской Библиях, например. Однако качество исполнения этих гравюр значительно ниже скорининских. Белорусский просветитель сумел по-своему построить композицию. Нимб, осеняющий голову бога, он вынес на рамку орнамента. А в гравюре пятого дня, дня сотворения небесных светил, вместо солнца и луны поместил свой герб. Для того времени это был необыкновенно смелый поступок. Он лишний раз доказывает, что белорусский гуманист явно шел вразрез с церковными традициями, безбоязненно срывая покров святости и таинственности.

В той же манере решена и небольшая гравюра к книге «Бог в раю». Скорина изобразил здесь бога простым человеком, обычным пастухом, отдыхающим на лоне созданного им мира. Причем художник, не считаясь ни с какими религиозными канонами, снял нимб с головы «создателя».

В гравюрах четвертой группы прослеживается достаточно вольное обращение с Библией, что вообще характерно для всего творчества Скорины. И хотя большинство работ белорусского просветителя необыкновенно своеобразно, оригинально, все же нельзя не отметить, что есть в этой группе гравюр и подражательные. В них явно чувствуется влияние известного немецкого художника Альбрехта Дюрера. Создается впечатление, что, например, в гравюре «Троица» Скорина сознательно повторяет распространенную, очень популярную работу Дюрера «Битва архангела Михаила с дьяволами». Однако даже в эту гравюру белорусский художник сумел внести много своего. Впервые он вводит в композицию трехликого бога — символ света. Таким

Вельмі ўдала, на супрацьстаўленні, вырашаны цэнтральныя вобразы гравюры да трэцяй «Кнігі Майсея» «Гасподь бог глаголет Мойсею у храму сведения» — вобразы пакутлівага Майсея і магутнага Саваофа.

Надзіва манументальная, вобразная фігура Давіда з гравюры «Цар Давід». Яе герой звяртаецца да бога з псалмамі. Гэта работа надрукавана ў «Псалтыры» 1517 г.

Гравюра «Генеалагічнае дрэва Ісуса», альбо «Корань Іясеяў», чымсьці нагадвае тыя, што змешчаны ў «Нюрнбергскай хроніцы» Шэдэля 1493 г. і ў чэшскай Біблii 1506 г. Толькі ў гэтых выданнях радаслоўная паказана на некалькіх аркушах, а ў Скарыны ўсё сабрана ў адзінай кампазіцыі. Мастак смела рэдагуе радаслоўную, выкідвае менш важных цароў. Кампазіцыя атрымалася больш вобразнай і выразнай.

Вялікую цікавасць выклікае гравюра «Прамудрасць божая». У цэнтры кампазіцыі — Хрыстос з кнігай у руках. Пад воблакамі, на якіх сядзіць бог,— зямля. А на гэтай зямлі — юнак у мантыі вучонага. Безумоўна, гэта і ёсць сам Скарына. Такое меркаванне ўжо было выказана мастацтвазнаўцам Уладзіміравым.

Гравюра надзвычай рытмічная, кожная дэталь у ёй прадуманая, ёй нададзена выразная акруглая форма: круглая зямля, круглы німб, авальная спіна юнака, герб аўтара і нават фігура Хрыста мае форму эліпса. Усё гэта стварае ўражанне кругавароту, які адбываецца ў прыродзе.

Беларускі першадрукар амаль заўсёды знаходзіў для сваіх кампазіцый патрэбны стыль, форму адлюстравання аўтарскай думкі. Талент мастака найбольш ярка выяўлены ў гравюры «Песня песняў». Штрых і лінія падабраны тут так тонка і так дакладна, што ствараюць уражанне светлай сімфоніі.

образом особенно ярко подчеркивается пафос борьбы добра со злом. И к тому же работа Скорины выполнена на более высоком художественном уровне. Херувимы, помещенные на этой гравюре, будто перенесены сюда с «Шестидневца».

Очень удачно, на противопоставлении, решены центральные образы гравюры к третьей «Книге Моисея» «Гасподь бог глаголет Моисею у храму сведения» — образы страдающего Моисея и могучего Саваофа.

Удивительно монументальна, образна фигура Давида с гравюры «Царь Давид». Ее герой обращается к богу с псалмами. Эта работа напечатана в «Псалтири» 1517 г.

Гравюра «Генеалогическое древо Иисуса», или «Корень Иесеев», чем-то напоминает те, что помещены в «Нюрнбергской хронике» Шеделя 1493 г. и в чешской Библии 1506 г. Только в этих изданиях родословная представлена на нескольких листах, а у Скорины все собрано в одной композиции. Художник смело редактирует родословную, выкидывая из нее менее важных царей. Композиция получилась более образной и выразительной.

Большой интерес представляет гравюра «Премудрость божия». В центре композиции — Христос с книгой в руках. Под облаками, на которых восседает бог,— земля. А на этой земле — юноша в мантии ученого. Безусловно — это сам Скорина. Такое предположение уже было высказано искусствоведом Владимировым.

Гравюра необыкновенно ритмична, каждая деталь в ней продумана, ей придана определенная округлая форма: круглая земля, круглый нимб, овальная спина юноши, герб автора и даже фигура Христа имеют форму эллипса. Все это создает впечатление круговорота, происходящего в природе.

Белорусский первопечатник почти всегда находил для своих композиций нужный стиль, форму выражения мысли. Талант художника наиболее ярко проявился в

ПЯТАЯ ГРУПА

Ужо гаварылася пра тое, што дзяленне гравюр на групы носіць чыста ўмоўны характар. Аднак некаторыя гравюры нельга аднесці ні да адной з гэтых чатырох умоўных груп, і таму іх трэба вылучыць. З чыста тэхнічнага боку яны маюць элементы, уласцівыя папярэднім групам. Такім чынам, шляхам параўнання можна прасачыць паступовы рост майстэрства мастака.

Гравюра «Благовествуеть Гавриіл пречистой девици богородици Марии» змешчана на тытульным лісце «Акафіста багародзіцы» з «Малой падарожнай кніжыцы». Схема яе кампазіцыі не новая. Яна сустракаецца ў чэшскім «Новым законе» 1498 г., у страсбургскім «Nortulus animae» 1507 г. і ў інш. На каленях перад аналоем — дзева Марыя. З затоенай усмешкай слухае яна архангела Гаўрыіла, які паведамляе, што ў яе хутка павінен нарадзіцца сын. У Скарыны са значна большым майстэрствам раскрыта псіхалогія герояў, іх духоўны свет.

На другой гравюры да «Малой падарожнай кніжыцы» — Марыя ўжо з дзіцем. Радасцю мацярынства асветлены яе твар. Уся сцэна быццам змалявана з натуры. І невыпадкова мастак адмаўляецца тут ад традыцыйных німбаў. Правобразам Марыі і багародзіцы з гравюры «Корань Іясеяў», відавочна, была адна і тая ж жанчына, з ярка выяўленымі рысамі тыпічнай славянкі.

Гравюра гэтай групы «Гасподь наш Ісусъ Христосъ во храме навчаеть законовчителей Іудейских» чымсьці нагадвае «Дыспут» (другая група), а гравюра «Святый Іоанъ предътеча, крещаеть воиордани Господа нашего Ісуса Христа» — «Эсфер» (першая група).

гравюре к книге «Песнь песней». Штрих и линия подобраны здесь так тонко и так точно, что создают впечатление светлой симфонии.

ПЯТАЯ ГРУППА

Уже говорилось о том, что деление гравюр на группы носит чисто условный характер. Однако некоторые гравюры нельзя отнести ни к одной из этих четырех условных групп. Поэтому их нужно выделить. С чисто технической стороны они имеют элементы, присущие предыдущим группам. Таким образом, путем сравнений можно проследить постепенный рост мастерства художника.

Гравюра «Благовествуеть Гавриіл пречистой девици богородици Марии» помещена на титульном листе «Акафиста богородицы» из «Малой подорожной книжицы». Схема ее композиции не нова. Она встречается в чешском «Новом законе» 1498 г., в страсбургском «Nortulus animae» 1507 г. и в др. На коленях перед аналоем — дева Мария. С затаенной улыбкой слушает она архангела Гавриила, который сообщает, что у нее скоро должен родиться сын.

На другой гравюре к «Малой подорожной книжице» — Мария уже с младенцем. Светлой радостью — радостью материнства озарено лицо девы. Вся сцена как будто списана с натуры. И не случайно поэтому художник отказывается здесь от традиционных нимбов. Прообразом Марии и богородицы с гравюры «Корень Иесеев», видимо, служила одна и та же женщина, с ярко выраженными чертами типичной славянки.

Гравюра этой группы «Гасподь наш Ісусъ Христосъ во храме навчаеть законовчителей Іудейских» чем-то напоминает «Диспут» (вторая группа), а гравюра «Свя-

Калі ўважліва прыгледзецца да гравюры «Еремеа Пророкъ гасподень плачеть Гледя Наерусалим», здаецца, што мастак перажыў адлюстраваную на гравюры падзею. І дакладна перадаў свае адносіны да яе. Багародзіца з тытульнага ліста «Малой падарожнай кніжыцы» чымсьці нагадвае ікону віленскага святатроіцкага манастыра. Гэта адзіная тэматычная гравюра, якая выканана на чорным фоне.

Але самую вялікую каштоўнасць маюць аўтапартрэты Францыска Скарыны. Іх два. Адзін — у кнізе «Ісус Сірахаў» 1517 г., другі — у чацвёртай «Кнізе царстваў» 1518 г. і ў кнізе «Быцця» 1519 г. Яны амаль нічым не адрозніваюцца адзін ад аднаго.

Беларускі першадрукар намаляваў сябе ў доктарскай мантыі. Ён сядзіць за пюпітрам, які накрыты абрусам. Перад ім — кніга. У руцэ — пяро. Яго рабочы пакой запоўнены прадметамі, якія сведчаць пра шматбаковую дзейнасць беларускага асветніка. Тут кнігі, глобус, пясочны гадзіннік — сімвал руху часу, свечка з рэфлектарам, якія характарызуюць нястомную працу, гарлачык з фарбамі, гравёрныя дошкі, кошык для паперы. Па баках гравюры — геральдычныя знакі. Велічныя львы, быццам на варце ідэй гуманізму, трымаюць гербы людзей, якія прымалі ўдзел у справах Скарыны. А на абрусе, якім засланы пюпітр, выразна намаляваны герб аўтара.

У вянцы з дубовых лісцяў надпіс — «а. ф. 31». У перакладзе на сучаснае летазлічэнне — 1517 год. Унізе беларускай вяззю выведзена: «Доктор Франциско Скорина». Гэта адзіны подпіс, які гаворыць пра аўтарства мастака. Злева — вензель з літар «М» і «З».

Яшчэ Стасаў лічыў: «...на тым жа лісце, стаіць манаграма, складзеная з літар М і З, яўна адзначаючая гравёра. Значэнне яе пакуль што застаецца загадкай. Магчыма, яна мае прамыя адносіны да асобы Скарыны, або стваральніка малюнкаў» [1].

тый Іоанъ предътеча крещаеть воиордани Госпада нашего Ісуса Христа» — «Эсфирь» (первая группа). Если внимательно присмотреться к гравюре «Еремеа Пророкъ гасподень плачеть Гледя Наерусалим», кажется, что художник пережил изображенное на гравюре событие и точно передал свое отношение к нему.

Богородица с титульного листа «Малой подорожной книжицы» чем-то напоминает икону виленского святотроицкого монастыря. Это единственная тематическая гравюра, выполненная на черном фоне.

Но самую большую ценность представляют для нас автопортреты Франциска Скорины. Их два. Один — в книге «Иисус Сирахов» 1517 г. Второй — в четвертой «Книге царствий» 1518 г. и в книге «Бытия» 1519 г. Они почти ничем не отличаются друг от друга.

Белорусский первопечатник изобразил себя в докторской мантии. Он сидит за пюпитром, покрытым скатертью. Перед ним — раскрытая книга. В руке — перо. Его рабочая комната заполнена предметами, свидетельствующими о многосторонней деятельности белорусского просветителя. Здесь книги, глобус, песочные часы — символ движения времени, свеча с рефлектором, характеризующая неустанный труд, кувшинчик с красками, граверные доски, корзина для бумаги. По сторонам гравюры — геральдические знаки. Величественные львы, как часовые на страже идей гуманизма, держат гербы людей, которые принимали участие в делах Скорины. А на скатерти, покрывающей пюпитр, отчетливо виден герб автора.

В венке из дубовых листьев надпись — «а. ф. 31». В переводе на современное летоисчисление — 1517 год. А внизу белорусской вязью выведено: «Доктор Франциско Скорина». Это единственная подпись, говорящая об авторстве художника. Левее — вензель из букв «М» и «З».

Хутчэй за ўсё гэта і будзе самае правільнае меркаванне. І расшыфроўваецца манаграма, відаць, так: «М» — загалоўная літара слова «малюнкі». Яно даволі часта сустракаецца на старонках кніг Скарыны, напрыклад у кнізе «Ісус Сірахаў»: «Он же чинить образы резаныя з древа, и пильность его применяеть малевание».

«З» — пачатковая літара слова «зделать». Яно таксама сустракаецца ў выданнях Скарыны. А можа быць «З» — загалоўная літара стараславянскага слова «зиждитель» (тварэц, стваральнік). Скарына звяртаўся і да стараславянізмаў.

Карацей кажучы, ёсць падставы сцвярджаць, што вензель «МЗ», які стаіць побач з подпісам «Доктор Франциско Скорина», трэба чытаць або як «Маляванне зделал доктар Францыско Скорина», або як «Малевания зиждитель доктар Франциско Скорина».

Дзякуючы гэтым унікальным партрэтам да нас дайшоў вобраз выдатнага сына беларускага народа.

Кожная дэталь, кожны штрых і лінія кампазіцыі выкананы з такім майстэрствам, што гэтыя гравюры, па сцвярджэнню Стасава, можна параўнаць з работамі лепшых нямецкіх мастакоў. Яны ўвабралі ўсё лепшае, усе дасягненні мастака мінулых гадоў. Гэта — вяршыня выяўленчай творчасці Скарыны.

ПРЫКЛАДНЫЯ ГРАВЮРЫ

Так ахарактарызаваў гэтую групу гравюр Мікола Шчакаціхін. Да іх адносяцца наступныя гравюры:

З «Кнігі Майсея» «Выхад».

Еще Стасов считал: «... на том же листе стоит монограмма, сложенная из букв М и З, явно определяющая гравера. Значение ее пока что остается загадкой. Возможно, она имеет прямое отношение к личности Скорины, или же создателя рисунков» [1].

Вероятнее всего, это и будет самое правильное суждение. И расшифровывается монограмма, видимо, так: «М» — заглавная буква слова «малюнкі» (рисунки). Оно часто встречается на страницах книг Скорины. Например в книге «Иисус Сирахов». «З» — начальная буква слова «зделать». Оно также встречается в изданиях Скорины. А может быть «З» — заглавная буква старославянского слова «зиждитель» (творец, создатель). Ведь Скорина прибегал и к старославянизмам.

Короче говоря, есть основания утверждать, что вензель «МЗ», стоящий рядом с подписью «Доктор Франциско Скорина», нужно читать или как «Малевание зделал доктор Франциско Скорина», или как «Малевания зиждитель доктор Франциско Скорина».

Благодаря этим уникальным портретам до нас дошел образ выдающегося сына белорусского народа.

Каждая деталь, каждый штрих и линия композиции выполнены с таким мастерством, что эти гравюры, по утверждению Стасова, можно сравнить с работами лучших немецких художников. Она вобрала все лучшее, все достижения художника прежних лет. Это вершина изобразительного творчества Скорины.

ПРИКЛАДНЫЕ ГРАВЮРЫ

Так охарактеризовал эту группу гравюр Микола Щекотихин. К ним относятся следующие гравюры:

1. «Образъ Требника нанемже приношаше Аарон жертвы».
2. «Взоръ Кивота или скрини завета господъня».
3. «Взоръ Ризъ жреческих еже быша Наароне» (у двух варыянтах).
4. «Взоръ светильника златого светиемъ его».
5. «Взоръ стола нанемже бе хлебъ посвященный».

З трэцяй «Кнігі царстваў».

6. «Взоръ моря или умывальници медяное».
7. «Взоръ дву столповъ иже предъ храмомъ».
8. «Взоръ храму господъня Отсаломона деланаго».
9. «Взоръ дому древяна царя Саломона».
10. «Образъ дву херувимовъ вмолитовници».
11. «Взоръ десяти подъставокъ и баней их».

ЗАСТАЎКІ, ВІНЬЕТКІ, МАНАГРАМЫ (ГЕРБЫ), ЗАГАЛОЎНЫЯ ЛІТАРЫ

Спецыяльна для кніг пражскага перыяду Скарына выразаў тры гравюры-застаўкі, якія змяшчаў пасля аўтарскай прадмовы, перад пачаткам біблейскага тэксту або ў канцы яго. На адной з заставак намаляваны дзеці, падобныя на анёлаў з гравюр «Шасцідзёна», «Тройцы» і іншых. Адзін анёл трымае лук, другі — факел.

На другой застаўцы — дзве паясныя жаночыя фігуры, якія нагадваюць свіцязянак. Прыгожыя галоўкі звернуты да цэнтра — туды, дзе змешчаны герб Скарыны.

Из «Книги Моисея» «Исход».

1. «Образъ Требника нанемже приношаше Аарон жертвы».
2. «Взоръ Кивота или скрини завета господъня».
3. «Взоръ Ризъ жреческих еже быша Наароне» (в двух вариантах).
4. «Взоръ светильника златого светиемъ его».
5. «Взоръ стола нанемже бе хлебъ посвященный».

Из третьей «Книги царствий».

6. «Взоръ моря или умывальници медяное».
7. «Взоръ дву столповъ иже предъ храмомъ».
8. «Взоръ храму господъня Отсаломона деланаго».
9. «Взоръ дому древяна царя Саломона».
10. «Образъ дву херувимовъ вмолитовници».
11. «Взоръ десяти подъставокъ и баней их».

ЗАСТАВКИ, ВИНЬЕТКИ, МОНОГРАММЫ (ГЕРБЫ), ЗАГЛАВНЫЕ БУКВЫ

Специально для книг пражского периода Скорина вырезал три гравюры-заставки, которые размещал после авторского предисловия, в начале библейского текста или в конце его. На одной из заставок изображены дети, напоминающие ангелов с гравюр «Шестидневца», «Троицы» и других. Один ангел держит лук, другой — факел.

На второй заставке — две поясные женские фигуры, напоминающие свитязянок. Изящные головки обращены к центру — туда, где помещен герб Скорины,

На трэцяй застаўцы — фігуры мужчын. Адной рукой яны абапіраюцца на шчыт, у другой руцэ ў іх зброя — драўляныя рагулі. На галаве, замест валасоў, як у Самсона з «Кнігі суддзяў», дубовыя лісты — сімвал сілы і славы мужчынскай. Вышэй цэнтральных фігур, у разгалістым дубе, герб Скарыны.

Заканамерная паслядоўнасць гравюр-заставак глыбока прадумана аўтарам.

Акрамя таго, у кнігах Скарыны змешчана вялікая колькасць віньетак (больш за 30). Многія з іх леглі ў аснову стварэння рамак для тытульных лістоў. Такі прыём асабліва часта сустракаецца ў віленскіх выданнях «Апостала» і ў «Малой падарожнай кніжыцы». Але часцей за ўсё віньеткі ў выданнях Скарыны ўжываюцца для мастацкага афармлення загалоўных літар, што робіць кніжны ліст непаўторна прыгожым.

Амаль на кожнай скарынінскай гравюры прысутнічае герб. Аб прыналежнасці і значэнні гэтага герба некаторыя даследчыкі творчасці беларускага першадрукара выказвалі розныя меркаванні. Большасць з іх, аднак, схілялася да таго, што гэта асабістая манаграма Францыска Скарыны. Адлюстраванне сонца з абліччам чалавека ў фас і месяца з чалавечым профілем сустракаюцца ў шмат якіх заходнееўрапейскіх друкаваных кнігах — у «Хроніцы» Шэдэля 1493 г., у «Евангеллі», выдадзеным Іаганам Грумгерам (Страсбург, 1514 г.), у лацінскай Біблії 1514 г. і г. д. Але ў гэтых выданнях сонца і месяц намаляваны паасобна, тады як на гравюрах Скарыны яны злучаны такім чынам, быццам сонца выглядае з-за месяца, асвятляючы яго сваімі праменнямі.

Чаму Скарына абраў іменна гэты герб? Паводле ж народных вераванняў, злучэнне месяца і сонца — дрэнная прыкмета. І летапісец «Слова аб палку Ігаравым» тлумачыць няўдалы паход Ігара благім прадвесцем — зацьменнем сонца. Затое Шэдэль,

На третьей заставке — фигуры мужчин. Одной рукой они опираются на щит, в другой руке зажато оружие — деревянная рогуля. На голове, вместо волос, как у Самсона из «Книги судей», дубовые листья — символ силы и славы мужской. Выше центральных фигур, в кроне развесистого дуба, герб Скорины.

Закономерная последовательность гравюр-заставок глубоко продумана автором.

Кроме того, в книгах Скорины помещено большое количество виньеток (более 30). Многие из них легли в основу создания рамок для титульных листов. Такой прием особенно часто встречается в виленских изданиях «Апостола» и в «Малой подорожной книжице». Но чаще всего виньетки в изданиях Скорины применяются для художественного оформления заглавных букв. Это делает книжный лист неповторимо прекрасным.

Почти на каждой скорининской гравюре присутствует герб. О принадлежности и значении этого герба некоторые исследователи творчества белорусского первопечатника высказывали различные предположения. Однако большинство склонялось к тому, что это собственная монограмма Франциска Скорины. Изображение солнца с ликом человека в фас и луны с человеческим профилем встречается во многих западноевропейских печатных книгах — в «Хронике» Шеделя 1493 г., в «Евангелии», изданном Иоганном Грумгером (Страсбург, 1514 г.), в латинской Библии 1514 г. и т. д. Но в этих изданиях солнце и луна нарисованы раздельно, тогда как на гравюрах Скорины они соединены таким образом, будто солнце выглядывает из-за месяца, освещая его своими лучами.

Почему же Скорина избрал именно такой герб? Ведь, согласно народным верованиям, соединение луны и солнца — плохая примета. И летописец «Слова о полку Игореве» объясняет неудачный поход Игоря дурным предзнаменованием — затмением

гаворачы аб нараджэнні Аляксандра Македонскага, падае такі стан сонца і месяца як добры знак.

Расшыфроўваючы значэнне гэтага герба, М. Шчакаціхін выказваў меркаванне, што Скарына адлюстраваў у ім сонечнае зацьменне, якое адбывалася над тэрыторыяй Беларусі ў 1486 г. Зыходзячы з гэтага, Шчакаціхін робіць вывад: герб сімвалізуе год нараджэння беларускага першадрукара. Магчыма, у гэтым і ёсць доля праўды, аднак галоўны сэнс герба — перамога святла над цемрай. Ва ўяўленні беларусаў сонца ўвасабляе святло, цеплыню, жыццё, месяц — цемру, ноч.

У гэтым альбоме ўпершыню поўнасцю сабраны гравюры, застаўкі, загалоўныя літары, змешчаныя ў выданнях Ф. Скарыны. Гэта дае магчымасць разглядаць, вывучаць, аналізаваць, параўноўваць адну работу з другой і рабіць найбольш правільныя высновы і заключэнні.

